law/BEA/1994/001/bel(c1)

# З А К О Н
# Рэспублікі Беларусь

## АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯ У АРТЫКУЛ 10 ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "АБ МЯСЦОВЫМ САМАКІРАВАННІ І МЯСЦОВАЙ ГАСПАДАРЦЫ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь п а с т а н а ў л я е:

1. У падпункце 14 пункта 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 лютага 1991 года "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 11 (13), арт. 122) выключыць словы "народных дэпутатаў".

2. Гэты Закон увесці ў дзеянне з дня прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — М.ГРЫБ

СЕКРЕТАРИАТ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРАТАКОЛЬНЫ СЕКТАР 1

30 сакавіка 1994 г.

г.Мінск

№ 2912-XII

Заказ.153 тир.2250 экз.БелНИИагроэнерго.

# П А С Т А Н О В А

# ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Аб правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь п а с т а н а ў л я е:

1. Назначыць дзень выбараў першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 23 чэрвеня 1994 года. Аб'явіць 23 чэрвеня 1994 года выхадным днём.

2. Ускласці паўнамоцтвы Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на Цэнтральную камісію па выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь.

У далейшым называць Цэнтральную камісію па выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў.

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў зацвердзіць да 6 красавіка 1994 года каштарыс расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у сямідзённы тэрмін з дня зацвярджэння каштарыса расходаў на правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь забяспечыць фінансаванне расходаў на гэтыя мэты.

5. Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць правядзенне рэспубліканскімі дзяржаўнымі органамі, мясцовымі Саветамі дэпутатаў, іх выканаўчымі і распарадчымі органамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

6. Мясцовым Саветам дэпутатаў, іх выканаўчым і распарадчым органам забяспечыць правядзенне арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у

адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь".

Усямерна садзейнічаць камісіям па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленні імі сваіх паўнамоцтваў, забяспечыць прадастаўленне неабходных для іх работы памяшканняў, абсталявання, транспарту, звестак і матэрыялаў.

7. Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрству ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь захаванне законнасці і грамадскага парадку з тым, каб кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь меў рэальныя магчымасці для ажыццяўлення свайго канстытуцыйнага права на свабоднае волевыяўленне ў ходзе выбараў.

8. Рэкамендаваць сродкам масавай інфармацыі забяспечыць усебаковае і аб'ектыўнае асвятленне парадку і ходу падрыхтоўкі да выбараў і правядзення галасавання.

Ураду Рэспублікі Беларусь сумесна з Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў вызначыць парадак карыстання кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь сродкамі масавай інфармацыі з мэтай забеспячэння роўных умоў для кожнага кандыдата ў Прэзідэнты.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — М.ГРЫБ

САКРАТАРЫЯТ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРАТАКОЛЬНЫ СЕКТАР 1

30 сакавіка 1994 г.

г.Мінск

№ 2911-XII

прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх ... калектываў, выбаршчыкаў.

## Артыкул 33. Падлік галасоў на ўчастку для галасавання

Скрынкі для галасавання ўскрываюцца ўчастковай камісіяй пасля аб'яўлення старшынёй камісіі аб заканчэнні галасавання. Ускрыццё скрынак для галасавання да заканчэння галасавання забараняецца. Перад распячатваннем скрынак для галасавання ўсе нявыкарыстаныя бюлетэні падлічваюцца, пагашаюцца, складваюцца ў пакет і апячатваюцца ўчастковай камісіяй. На пакеце надпісваюцца назва і нумар участка, колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў. Пакет падпісваецца старшынёй участковай камісіі ў прысутнасці членаў камісіі.

Участковая камісія па спісу выбаршчыкаў устанаўлівае агульную колькасць выбаршчыкаў на ўчастку, а таксама колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні. На падставе бюлетэняў, што знаходзіліся ў скрынках для галасавання, камісія ўстанаўлівае агульную колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, колькасць галасоў, пададзеных за і супраць кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі. Па прозвішчах грамадзян, дадаткова ўпісаных выбаршчыкамі ў бюлетэні, галасы не падлічваюцца.

Пры падліку галасоў улічваюцца галасы выбаршчыкаў, якія перададзены ва ўчастковую камісію ў адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 32 гэтага Закона да дня выбараў.

Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні неўстаноўленага ўзору, а таксама бюлетэні, у якіх пры галасаванні пакінута больш аднаго кандыдата. Пры ўзнікненні сумненняў у сапраўднасці бюлетэня пытанне вырашаецца ўчастковай камісіяй шляхам галасавання.

Вынікі падліку галасоў разглядаюцца на пасяджэнні ўчастковай камісіі і заносяцца ў пратакол.

Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і неадкладна перадаецца ў адпаведную раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 34. Падлік галасоў у тэрытарыяльных камісіях па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Раённая, гарадская, раённая ў горадзе камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых камісій, устанаўлівае агульную колькасць выбаршчыкаў, колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, колькасць галасоў, пададзеных за і супраць кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, а таксама колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі, і колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Раённая, гарадская, раённая ў горадзе камісія ўстанаўлівае на сваім пасяджэнні вынікі галасавання па раёну, гораду, раёну ў горадзе і складае пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і не пазней чым у двухдзённы тэрмін пасля дня выбараў перадаецца ў адпаведную абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абласная, Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе пратаколаў, атрыманых ад адпаведных раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій, устанаўлівае агульную колькасць выбаршчыкаў, колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, колькасць галасоў, пададзеных за і супраць кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, а таксама колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі, і колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Абласная, Мінская гарадская камісія ўстанаўлівае на сваім пасяджэнні вынікі галасавання па вобласці, гораду Мінску і складае аб гэтым пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і не пазней чым у чатырохдзённы тэрмін пасля дня выбараў перадаецца ў Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 35. Устанаўленне і апублікаванне вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

На падставе пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь н пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін пасля дня выбараў Цэнтральная камісія па

выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь устанаўлівае і ўносіць у пратакол наступныя даныя:

агульную колькасць выбаршчыкаў;

колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні;

колькасць галасоў, пададзеных за, і колькасць галасоў, пададзеных супраць кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікамі старшыні, сакратаром і членамі Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь лічыцца выбраным, калі за яго прагаласавалі больш паловы грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Выбары прызнаюцца неадбыўшыміся, калі ў іх прынялі ўдзел менш паловы грамадзян, унесеных у спісы выбаршчыкаў, а таксама ў сувязі з выбыццём усіх зарэгістраваных кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у цэлым па рэспубліцы або па асобных участках для галасавання, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, абласцях, гораду Мінску могуць быць прызнаны несапраўднымі з-за дапушчаных у ходзе выбараў або пры падліку галасоў парушэнняў, калі яны паўплывалі на вынікі выбараў у цэлым па рэспубліцы. Рашэнне аб прызнанні выбараў несапраўднымі прымаецца Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу дзесяці дзён. Права абскарджання рашэння аб прызнанні выбараў несапраўднымі належыць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Паведамленне аб выніках выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь перадаецца Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сродкам масавай інфармацыі для абнародавання і апублікавання не пазней чым праз тры дні з моманту падпісання пратакола аб выніках выбараў.

Артыкул 36. Другі тур галасавання

Калі ў бюлетэнь было ўключана больш двух кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і ні адзін з іх не набраў неабходнай колькасці галасоў, то ў двухтыднёвы тэрмін Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праводзіцца другі тур галасавання па двух кандыдатах, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў. Паведамленне аб правядзенні другога тура галасавання публікуецца ў друку ў трохдзённы тэрмін.

Выбраным лічыцца кандыдат у Прэзідэнты, які атрымаў у другім туры галасавання больш паловы галасоў выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

Калі ў сувязі са зняццем кандыдатур застаецца адзін кандыдат, другі тур галасавання праводзіцца па яго кандыдатуры. У гэтым выпадку за яго выбранне павінны прагаласаваць больш паловы выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

Выбары лічацца адбыўшыміся, калі ў іх прынялі ўдзел больш паловы выбаршчыкаў, унесеных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах.

Артыкул 37. Паўторныя выбары

Калі на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь балаціраваліся не больш двух кандыдатаў у Прэзідэнты і ні адзін з іх не быў выбраны, а таксама ў выпадку прызнання выбараў Прэзідэнта неадбыўшыміся або несапраўднымі ці другі тур галасавання не дазволіў вызначыць выбранага Прэзідэнта, Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вырашае пытанне аб назначэнні паўторных выбараў з паўторным вылучэннем кандыдатаў у Прэзідэнты. Пры гэтым яна можа прыняць рашэнне аб правядзенні выбараў тэрытарыяльнымі і участковымі камісіямі ў новым складзе.

Паўторныя выбары праводзяцца на працягу трох месяцаў пасля асноўных выбараў. Галасаванне праводзіцца на тых жа ўчастках для галасавання па спісах, складзеных для правядзення асноўных выбараў і ўдакладненых напярэдадні паўторных выбараў.

Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іншыя мерапрыемствы, звязаныя з правядзеннем паўторных выбараў Прэзідэнта, праводзяцца ў парадку, устаноўленым гэтым

...ьбонам.

Паведамленне аб правядзенні паўторных выбараў у трохдзённы тэрмін публікуецца ў друку і абнародуецца ў іншых сродках масавай інфармацыі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

САКРАТАРЫЯТ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ПРАТАКОЛЬНЫ СЕКТАР
1

М.ГРЫБ

29 сакавіка 1994 г.

г.Мінск

№ 2909-ХІІ

# ПАСТАНОВА

## ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь п а с т а н а ў л я е:

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" з 30 сакавіка 1994 года.

2. Даручыць Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па заканадаўству ўнесці на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь неабходныя змяненні і дапаўненні, звязаныя з парушэннем заканадаўства аб выбарах Прэзідэнта, у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь і Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — М.ГРЫБ

29 сакавіка 1994 г.

г.Мінск

№ 2910-XII

Рэспублікі Беларусь мае права ў любы час да выбараў замяніць давераных асоб.

Давераная асоба не можа знаходзіцца ў складзе камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і з моманту рэгістрацыі яго Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь лічыцца вызваленай ад абавязкаў у камісіі.

Артыкул 27. Гарантыі дзейнасці кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іх давераных асоб

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з часу іх рэгістрацыі Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удзельнічаюць у выбарчай кампаніі на роўных пачатках, маюць аднолькавае права на выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Усім зарэгістраваным кандыдатам у Прэзідэнты прадастаўляюцца роўныя магчымасці матэрыяльна-тэхнічнага і фінансавага забеспячэння выбарчай кампаніі.

Зарэгістраваныя кандыдаты ў Прэзідэнты на перыяд правядзення перадвыбарнай кампаніі маюць права на вызваленне ад вытворчых або службовых абавязкаў з захаваннем сярэдняй заработнай платы па месцы работы за кошт сродкаў, што выдзяляюцца на правядзенне выбараў. Такое ж права маюць давераныя асобы кандыдата ў Прэзідэнты.

Кандыдаты ў Прэзідэнты маюць права на бясплатны праезд на ўсіх відах пасажырскага (за выключэннем таксі) транспарту ў межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Кандыдаты ў Прэзідэнты, давераныя асобы кандыдатаў у Прэзідэнты на перыяд выбарчай кампаніі не могуць быць звольнены з работы, а таксама пераведзены на іншую работу або пасаду без іх згоды.

Кандыдат у Прэзідэнты не можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, падвергнуты арышту, затрыманню або мерам адміністрацыйнага спагнання, якія накладаюцца ў судовым парадку без згоды Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Перадвыбарная агітацыя

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам, даверaным асобам кандыдатаў у Прэзідэнты прадастаўляецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання выбарчых праграм кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, палітычных, дзелавых і асабістых якасцей кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, весці агітацыю за або супраць кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь на сходах, мітынгах, у друку, па тэлебачанню і радыё, у час сустрэч з выбаршчыкамі.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія ўдзельнічаюць у выбарах, праводзяць сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі на сходах або ў іншай зручнай для выбаршчыкаў форме. Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў дэпутатаў абавязаны садзейнічаць правядзенню такіх сустрэч.

З моманту рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь група дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або ініцыятыўная група грамадзян па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія вылучылі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь маюць права ў адпаведнасці з артыкулам 6 гэтага Закона на выраб перадвыбарных заклікаў, заяў, надпісаў, лісткоў, фотаматэрыялаў і інш.* Плакаты з'яўляюцца друкаванай прадукцыяй, для вырабу якой не патрабуецца спецыяльнага дазволу.

Пасля завяршэння рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў дэпутатаў па ўзгадненню з камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выдзяляюць на тэрыторыі кожнага ўчастка для галасавання месцы, якія найбольш наведваюцца грамадзянамі, для размяшчэння выбарчых плакатаў.

Выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў дэпутатаў могуць забараняць размяшчэнне выбарчых плакатаў у неадведзеных для іх месцах.

Не дапускаецца зняцце, зрыў, замазванне, пашкоджанне выбарчых

---

* У далейшым -- плакаты.

плакатаў, калі гэтыя плакаты не размешчаны ў забароненых месцах.

Агітацыя ў дзень выбараў не дапускаецца.

Артыкул 29. Бюлетэнь па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Форму і тэкст бюлетэня па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацвярджае Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У бюлетэнь уключаюцца ў алфавітным парадку ўсе зарэгістраваныя кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння, займаемай пасады (занятку), месца работы, партыйнасці.

Бюлетэні па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь друкуюцца на беларускай мове.

## РАЗДЗЕЛ III. ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 30. Час і месца галасавання

Пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь галасаванне праводзіцца ў дзень выбараў з 7 да 22 гадзін. Аб часе і месцы галасавання ўчастковая камісія паведамляе выбаршчыкам не пазней чым за дзесяць дзён да выбараў.

На ўчастках для галасавання, утвораных у воінскіх часцях, санаторыях і дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбных установах, участковая камісія можа аб'явіць галасаванне закончаным у любы час, калі прагаласавалі ўсе выбаршчыкі, уключаныя ў спіс.

Артыкул 31. Арганізацыя галасавання

Галасаванне праводзіцца ў спецыяльна адведзеных памяшканнях, у якіх павінны быць абсталяваны ў дастатковай колькасці кабіны або пакоі для тайнага галасавання, вызначаны месцы выдачы бюлетэняў і ўстаноўлены скрынкі для галасавання. Скрынкі для галасавання ўстанаўліваюцца такім чынам, каб галасуючыя пры падыходзе да іх абавязкова праходзілі праз кабіны або пакоі для тайнага галасавання.

Адказнасць за арганізацыю галасавання, забеспячэнне тайны волевыяўлення выбаршчыкаў, абсталяванне памяшканняў і падтрыманне ў іх неабходнага парадку нясе ўчастковая камісія.

У дзень выбараў перад пачаткам галасавання скрынкі для галасавання правяраюцца, пламбіруюцца або апячатваюцца старшынёй участковай камісіі ў прысутнасці ўсіх членаў камісіі.

Кожны выбаршчык галасуе асабіста, галасаванне за іншых асоб не дапускаецца. Бюлетэнь выдаецца выбаршчыку адпаведнай участковай камісіяй на падставе спіса выбаршчыкаў па прад'яўленні пашпарта або іншага пасведчання асобы. Пры атрыманні бюлетэня галасуючы распісваецца супраць свайго прозвішча ў спісе.

## Артыкул 32. Правядзенне галасавання

Бюлетэнь па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь запаўняецца галасуючым у кабіне або пакоі для тайнага галасавання. Пры запаўненні бюлетэня забараняецца прысутнасць каго б там ні было, акрамя галасуючага. Выбаршчык, які не мае магчымасці самастойна запоўніць бюлетэнь, мае права запрасіць у кабіну або пакой іншую асобу паводле свайго меркавання, акрамя члена ўчастковай камісіі.

Пры галасаванні выбаршчык ва ўмовах, якія выключаюць кантроль за яго волевыяўленнем, выкрэслівае ў бюлетэні прозвішчы кандыдатаў, супраць якіх ён галасуе.

Запоўнены бюлетэнь выбаршчык апускае ў скрынку для галасавання.

Выбаршчык, які не мае магчымасці ў дзень выбараў знаходзіцца па месцы свайго жыхарства, мае права не раней чым за 10 дзён да выбараў ва ўмовах, што выключаюць кантроль за яго волевыяўленнем, запоўніць бюлетэнь і апусціць яго ў асобную скрынку для галасавання выбаршчыкаў, якія адсутнічаюць у дзень выбараў па месцы свайго жыхарства.

У выпадках, калі асобныя выбаршчыкі па стану здароўя або іншых уважлівых прычынах не могуць прыйсці ў памяшканне для галасавання, участковая камісія па іх просьбе, выказанай у пісьмовай або вуснай форме, даручае не менш чым двум членам камісіі арганізаваць галасаванне па месцы знаходжання гэтых выбаршчыкаў у дзень выбараў. Пры гэтым маюць права прысутнічаць



**З А К О Н**

**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

**П А С Т А Н О В А**

**ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь**
**«Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»**

**П А С Т А Н О В А**

**ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Аб правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

**З А К О Н**

**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Аб унясенні змянення ў артыкул 10 Закона Рэспублікі Беларусь**
**«Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы**
**ў Рэспубліцы Беларусь»**

# З А К О Н
# Рэспублікі Беларусь

## АБ ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

#### Артыкул 1. Асновы выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь не менш дзесяці гадоў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца тэрмінам на пяць гадоў. Адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не больш двух тэрмінаў.

#### Артыкул 2. Прынцыпы правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца ўсеагульнымі: права выбіраць маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў.

Якія-небудзь прамыя або ўскосныя абмежаванні выбарчых правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь у залежнасці ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі, палітычных поглядаў, роду і характару заняткаў забараняюцца.

У выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія

ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. У галасаванні не прымаюць удзел асобы, у адносінах да якіх у парадку, установленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання -- утрыманне пад вартай.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца роўнымі: кожны выбаршчык мае адзін голас.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца прамымі: Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь.

Галасаванне на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляецца тайным: кантроль за волевыяўленнем галасуючых не дапускаецца.

Артыкул 3. Правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Утварэнне ўчасткаў для галасавання

Для арганізацыі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, тэрытарыяльныя (абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах) і ўчастковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Для правядзення галасавання ўтвараюцца ўчасткі.

Артыкул 4. Галоснасць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Дзейнасць камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных і грамадскіх органаў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца адкрыта і галосна.

Рашэнні адпаведных дзяржаўных і грамадскіх органаў па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падлягаюць абнародаванню ў сродках масавай інфармацыі на працягу пяці дзён з моманту іх прыняцця.

камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь інфармуюць грамадзян аб сваёй рабоце, складзе, месцы знаходжання і часе работы.

На пасяджэннях камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ў дзень выбараў -- у памяшканнях для галасавання з моманту апячатвання выбарчых скрынак да заканчэння падвядзення вынікаў галасавання маюць права прысутнічаць дэпутаты, прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, выбаршчыкаў, сродкаў масавай інфармацыі, давераныя асобы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама наглядальнікі ад іншых дзяржаў і міжнародных арганізацый. Паўнамоцтвы ўказаных асоб павінны быць засведчаны адпаведным дакументам, і аб іх прысутнасці паведамляецца камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не пазней чым за два дні.

Сродкі масавай інфармацыі асвятляюць ход падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; іх прадстаўнікам гарантуецца бесперашкодны доступ на ўсе сходы і пасяджэнні, звязаныя з выбарамі. Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя органы, палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы прадастаўляюць сродкам масавай інфармацыі неабходную інфармацыю, звязаную з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў.

Артыкул 5. Права вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

Кандыдаты на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вылучаюцца не менш чым 70 дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзянамі Рэспублікі Беларусь -- пры наяўнасці не менш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў.

Артыкул 6. Расходы, звязаныя з выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Расходы, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, робяцца толькі за кошт сродкаў дзяржавы з рэспубліканскага бюджэту ў памеры, які зацвярджаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Парадак размеркавання і выкарыстання грашовых сродкаў устанаўлівае Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі

Беларусь.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прадстаўляе Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь справаздачу аб расходаванні выдзеленых ёй з бюджэту сродкаў не пазней шасці месяцаў з моманту выбрання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сродкі, якія выкарыстоўваюцца для правядзення перадвыбарнай агітацыі, падзяляюцца пароўну паміж усімі кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і расходуюцца па іх патрабаванню ў парадку, устаноўленым Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь абавязана паведаміць памер сродкаў, выдзеленых на перадвыбарную агітацыю кожнага кандыдата, праз сродкі масавай інфармацыі не пазней чым праз тры дні пасля сканчэння тэрміну рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі, дзяржаўныя і грамадскія органы прадастаўляюць у распараджэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь неабходныя для падрыхтоўкі і правядзення выбараў памяшканні, абсталяванне і транспартныя сродкі.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі бясплатна абнародуюць матэрыялы, прадастаўленыя камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і перадвыбарныя праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Забараняецца які-небудзь прамы або ўскосны ўдзел замежных арганізацый і замежных грамадзян у фінансаванні і іншай матэрыяльнай дапамозе выбарчай кампаніі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 7. Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Асобы, якія шляхам прымусу, падману, пагроз або іншым спосабам перашкаджаюць свабоднаму ажыццяўленню грамадзянінам Рэспублікі Беларусь права выбіраць і быць выбраным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, весці перадвыбарную агітацыю, перашкаджаюць рабоце камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праводзяць агітацыю ў дзень выбараў, а таксама члены камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, службовыя асобы дзяржаўных

і грамадскіх органаў і іншыя асобы, якія ўчынілі падлог выбарчых дакументаў, заведама няправільны падлік галасоў, парушылі тайну галасавання, не прадставілі камісіям па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь неабходныя матэрыялы ці не выканалі іх рашэнні або дапусцілі іншыя парушэнні гэтага Закона, нясуць установленую законам адказнасць. Да адказнасці прыцягваюцца таксама асобы, якія апублікавалі або іншым спосабам распаўсюдзілі лжывыя звесткі, што знеслаўляюць кандыдатаў у Прэзідэнты, а таксама публічна заклікалі да байкатавання выбараў.

Пры парушэнні кандыдатам у Прэзідэнты гэтага Закона ён папярэджваецца абласной, Мінскай гарадской камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а пры паўторным парушэнні Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню абласной, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь можа адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі гэтага кандыдата ў Прэзідэнты.

Заявы аб парушэннях заканадаўства аб выбарах, якія паступілі ў камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя і грамадскія органы ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў або пасля выбараў, павінны разглядацца ў трохдзённы тэрмін, а паступіўшыя ў дзень выбараў -- неадкладна.

## РАЗДЗЕЛ II. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 8. Назначэнне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь не пазней чым за пяць месяцаў і праводзяцца не пазней чым за два месяцы да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга Прэзідэнта.

Калі пасада Прэзідэнта аказалася вакантнай, выбары праводзяцца не раней чым праз 30 дзён і не пазней чым праз 70 дзён з дня адкрыцця вакансіі. Пры гэтым скарочаныя тэрміны правядзення перадвыбарных мерапрыемстваў устанаўліваюцца Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні па забеспячэнню правядзення рэспубліканскімі дзяржаўнымі органамі, мясцовымі Саветамі дэпутатаў, іх выканаўчымі

і распарадчымі органамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прымаюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 9. Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Для падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца наступныя камісіі:

1) Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

2) абласныя і Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

3) раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

4) участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у гарадах раённага падпарадкавання не ўтвараюцца.

Артыкул 10. Паўнамоцтвы Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Паўнамоцтвы Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) ажыццяўляе кантроль на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь за выкананнем гэтага Закона, дае растлумачэнні з мэтай яго аднолькавага прымянення, уваходзіць у выпадку неабходнасці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь з прадстаўленнем аб тлумачэнні гэтага Закона,

2) накіроўвае дзейнасць абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах, участковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

3) размяркоўвае грашовыя сродкі, прадугледжаныя для правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кантралюе забеспячэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядае іншыя пытанні і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння;

4) устанаўлівае формы бюлетэня і спісу грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пратаколаў пасяджэнняў камісій і іншых дакументаў па правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узоры скрынак для галасавання і пячатак камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, парадак захоўвання дакументаў па правядзенню выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

5) заслухоўвае паведамленні дзяржаўных і грамадскіх органаў па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

6) разглядае заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і выносіць па іх рашэнні. Рашэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выпадках, прадугледжаных гэтым Законам, могуць быць абскарджаны ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь;

7) вырашае пытанні аб парадку ўдзелу ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

8) рэгіструе кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іх давераных асоб і выдае ім адпаведныя пасведчанні;

9) падводзіць вынікі выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па рэспубліцы, перадае сродкам масавай інфармацыі для абнародавання і апублікавання паведамленне аб выніках выбараў і выдае выбранаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь пасведчанне аб яго выбранні;

10) вырашае пытанні, звязаныя з правядзеннем другога тура галасавання, паўторных выбараў і выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выпадку вакансіі пасады Прэзідэнта;

11) ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам.

Артыкул 11. Утварэнне абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца абласнымі, Мінскім гарадскім Саветамі дэпутатаў або іх прэзідыумамі (выканаўчымі камітэтамі) у складзе 9--15 членаў камісіі не пазней чым за 80 дзён да выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, сходаў выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскіх часцях, а таксама прадстаўнікоў выбаршчыкаў, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы. Рашэнне аб утварэнні камісій, іх складзе і месцазнаходжанні ў пяцідзённы тэрмін публікуецца ў друку.

Тэрмін паўнамоцтваў абласных, Мінскай гарадской камісій заканчваецца пасля завяршэння выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) ажыццяўляюць кантроль за выкананнем гэтага Закона на тэрыторыі вобласці, горада Мінска;

2) накіроўваюць дзейнасць раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

3) заслухоўваюць паведамленні кіраўнікоў мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

4) наглядаюць за своечасовасцю складання спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і прадстаўленнем іх для ўсеагульнага азнаямлення;

5) размяркоўваюць грашовыя сродкі паміж раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кантралююць забеспячэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядаюць іншыя пытанні іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння;

6) ажыццяўляюць кантроль за выкананнем ініцыятыўнай групай

грамадзян па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты патрабаванняў гэтага Закона пры зборы подпісаў выбаршчыкаў;

7) на падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі свае подпісы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты, падводзяць вынікі па вобласці, гораду Мінску, складаюць аб гэтым пратакол і накіроўваюць яго ў Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

8) ажыццяўляюць выраб бюлетэняў і забеспячэнне імі раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

9) устанаўліваюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па вобласці, гораду Мінску і паведамляюць аб іх у Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

10) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні раённых, гарадскіх, раённых у гарадах, участковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прымаюць па іх рашэнні;

11) ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам.

### Артыкул 13. Утварэнне раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах Саветамі дэпутатаў або іх прэзідыумамі (выканаўчымі камітэтамі) у складзе 9--13 членаў камісіі не пазней чым за 80 дзён да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, сходаў выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскіх часцях, а таксама прадстаўнікоў выбаршчыкаў, якія вылучаны ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Рашэнне аб утварэнні камісій, іх складзе і месцазнаходжанні ў пяцідзённы тэрмін публікуецца ў друку.

Тэрмін паўнамоцтваў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заканчваецца пасля завяршэння выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

:.......

Артыкул 14. Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) ажыццяўляюць кантроль за выкананнем гэтага Закона на адпаведнай тэрыторыі;

2) устанаўліваюць нумарацыю ўчасткаў для галасавання;

3) накіроўваюць дзейнасць участковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

4) заслухоўваюць паведамленні кіраўнікоў мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

5) ажыццяўляюць кантроль за выкананнем ініцыятыўнай групай грамадзян па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты патрабаванняў гэтага Закона пры збіранні подпісаў выбаршчыкаў і забяспечваюць дакладнасць даных аб колькасці такіх подпісаў;

6) падводзяць вынікі па раёну, гораду, раёну ў горадзе аб колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі свае подпісы па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты, складаюць аб гэтым пратакол і неадкладна накіроўваюць яго адпаведна ў абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

7) наглядаюць за своечасовым прадстаўленнем участковымі камісіямі для ўсеагульнага азнаямлення спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

8) забяспечваюць участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь бюлетэнямі для галасавання;

9) устанаўліваюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па раёну, гораду, раёну ў горадзе і паведамляюць аб іх адпаведна ў абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

10) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прымаюць па іх рашэнні;

11) размяркоўваюць грашовыя сродкі паміж участковымі камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

12) ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам.

Артыкул 15. Утварэнне ўчасткаў для галасавання

Для правядзення галасавання і падліку галасоў тэрыторыя раёнаў, гарадоў, раёнаў у гарадах падзяляецца на ўчасткі для галасавання, якія адпавядаюць выбарчым участкам, што ўтвараюцца для выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Участкі для галасавання могуць быць утвораны ў санаторыях і дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбных установах. За межамі Рэспублікі Беларусь участкі для галасавання ўтвараюцца кіраўнікамі дыпламатычных (консульскіх) прадстаўніцтваў, якія працуюць на тэрыторыі адпаведных дзяржаў.

Участкі для галасавання ўтвараюцца раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах Саветамі дэпутатаў або іх прэзідыумамі (выканаўчымі камітэтамі) не пазней чым за два месяцы да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Участкі для галасавання ўтвараюцца з колькасцю не менш 20 і не больш 3000 грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Савет дэпутатаў або яго прэзідыум (выканаўчы камітэт), што ўтварыў участак, паведамляе грамадзянам, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, аб межах кожнага ўчастка для галасавання з указаннем месца знаходжання ўчастковай камісіі і памяшкання для галасавання.

У выпадку ўтварэння ўчасткаў для галасавання за межамі Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прыпісвае іх да раёна горада Мінска па месцы знаходжання Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Утварэнне ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца не пазней чым за 45 дзён да выбараў у складзе 5--19 членаў.

Участковыя камісіі ўтвараюцца раённымі, гарадскімі Саветамі гарадоў раённага падпарадкавання і гарадоў з раённым дзяленнем.

......

раённымі ў гарадах Саветамі дэпутатаў або іх прэзідыумамі (выканаўчымі камітэтамі) з прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, сходаў выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскіх часцях, а таксама выбаршчыкаў, якія вылучаны ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Рашэнне аб утварэнні ўчастковых камісій, іх складзе, а таксама месцазнаходжанні з указаннем адраса ў пяцідзённы тэрмін публікуецца ў друку. За межамі Рэспублікі Беларусь участковыя камісіі ўтвараюцца кіраўнікамі дыпламатычных (консульскіх) прадстаўніцтваў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных дзяржаў.

Тэрмін паўнамоцтваў участковай камісіі заканчваецца пасля завяршэння выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 17. Паўнамоцтвы ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) складаюць па ўчастках спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

2) праводзяць азнаямленне грамадзян са спісамі асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прымаюць і разглядаюць заявы аб няправільнасцях у спісах і вырашаюць пытанне аб унясенні ў іх адпаведных змяненняў;

3) забяспечваюць захаванасць бюлетэняў для галасавання, прымаюць бюлетэні ад выбаршчыкаў, якія прагаласавалі да дня выбараў ва ўстаноўленым гэтым Законам парадку;

4) паведамляюць грамадзянам аб дні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і месцы галасавання;

5) забяспечваюць падрыхтоўку памяшканняў для галасавання і скрынак для галасавання;

6) арганізуюць галасаванне ў дзень выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на ўчастках;

7) праводзяць падлік галасоў, пададзеных на ўчастках;

8) разглядаюць заявы і скаргі па пытаннях падрыхтоўкі выбараў і арганізацыі галасавання і прымаюць па іх рашэнні;

9) ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам.

## Артыкул 18. Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных і ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, сходы выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых (грамадзян Рэспублікі Беларусь) па воінскіх часцях, а таксама выбаршчыкі шляхам падачы заявы могуць вылучаць у адпаведную тэрытарыяльную і ўчастковую камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь толькі аднаго прадстаўніка.

Вылучаць сваіх прадстаўнікоў членамі тэрытарыяльных і ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь маюць права:

1) рэспубліканскі кіруючы орган палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, іх тэрытарыяльныя кіруючыя органы -- у тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іх пярвічныя арганізацыі -- ва ўчастковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Указаныя органы вылучаюць прадстаўнікоў на пасяджэннях (пленумах, канферэнцыях, сходах);

2) сходы (канферэнцыі) працоўных калектываў, выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскіх часцях -- у тэрытарыяльныя і ўчастковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь маюць права таксама структурныя падраздзяленні працоўных калектываў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый;

3) выбаршчыкі шляхам падачы заявы ў адпаведны Савет дэпутатаў, яго прэзідыум (выканаўчы камітэт) -- у абласную, Мінскую гарадскую камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі заява падпісана не менш чым 100 выбаршчыкамі, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай вобласці або горада Мінска; у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі заява падпісана не менш чым 50 выбаршчыкамі, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнага раёна, горада, раёна ў горадзе, і ва ўчастковую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі заява падпісана не менш чым 20 выбаршчыкамі, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнага ўчастка для галасавання.

Пратакол сходу (пасяджэння, канферэнцыі) або заява, падпісаная выбаршчыкамі аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад камісіі

па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прадстаўляецца ў орган, які ўтварае камісію, не пазней чым за пяць дзён да ўстаноўленага гэтым Законам тэрміну ўтварэння адпаведнай камісіі.

У пратаколе ўказваюцца: назва органа, які вылучыў прадстаўніка ў склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, яго адрас і нумар тэлефона, колькасць членаў органа, удзельнікаў пасяджэння, пленума, канферэнцыі, вынікі галасавання, дата прыняцця рашэння, прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, займаемая пасада (занятак), месца работы, адрас асобы, прадстаўленай членам камісіі. Адпаведныя даныя ўказваюцца і ў пратаколе сходу калектыву, сходу выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскай часці. Пратакол падпісваецца старшынёй і сакратаром пасяджэння, пленума, канферэнцыі, сходу. У заяве таксама ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння і адрас выбаршчыкаў, якія падпісалі заяву.

Уключаць сваіх прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных і ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь маюць права таксама прэзідыумы або выканаўчыя камітэты адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў.

У склад камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не могуць уваходзіць кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іх даверанЫя асобы.

### Артыкул 19. Парадак змянення складу камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Асоба, якая ўваходзіць у склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, павінна вызваляцца ад выканання сваіх абавязкаў у камісіі:

1) у выпадках, прадугледжаных часткай 6 артыкула 18 гэтага Закона;

2) па асабістай заяве; у выпадку адклікання або пазбаўлення паўнамоцтваў.

Права адклікання належыць органу, які вылучыў асобу ў склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Асоба, якая ўваходзіць у склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, вызваляецца ад выканання абавязкаў у камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па асабістай заяве, а

таксама пазбаўляецца паўнамоцтваў пры парушэнні гэтага Закона або сістэматычным невыкананні сваіх абавязкаў органам, які утварыў камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пры выбыцці асобы са складу камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (па указаных і іншых прычынах) палітычная партыя, грамадскае аб'яднанне, працоўны калектыў, сход выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскай часці, выбаршчыкі могуць рэкамендаваць ва ўстаноўленым гэтым Законам парадку новага прадстаўніка ў склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 20. Арганізацыя работы камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Старшыня, намеснік старшыні і сакратар абласной, Мінскай гарадской, раённай, гарадской, раённай у горадзе, участковай камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выбіраюцца на першым пасяджэнні адпаведнай камісіі.

Пасяджэнні камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь склікаюцца і праводзяцца старшынёй, а ў выпадку яго адсутнасці або па яго даручэнню -- намеснікам старшыні камісіі. Пасяджэнне праводзіцца таксама па патрабаванню не менш адной трэці членаў камісіі.

Пасяджэнні камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш двух трацей складу камісіі. Рашэнні камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад агульнага складу камісіі. Члены камісіі, не згодныя з яе рашэннем, маюць права выказаць асобую думку, якая ў пісьмовай форме прыкладаецца да пратакола.

Рашэнні камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прынятыя ў межах яе паўнамоцтваў, абавязковыя для выканання ўсімі дзяржаўнымі і грамадскімі органамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі.

Рашэнні і дзеянні камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Законам, таксама ў суд.

Па рашэнню камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь асобныя яе члены могуць вызваляцца ў перыяд падрыхтоўкі і

......

правядзення выбараў ад выканання вытворчых або службовых абавязкаў з захаваннем сярэдняй заработнай платы за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца на правядзенне выбараў.

Аплата працы членаў камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і супрацоўнікаў іх апарату можа таксама праводзіцца зыходзячы з фактычна адпрацаванага часу ў камісіі.

Асобы, якія ўваходзяць у склад камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, не маюць права прымаць удзел у агітацыі за або супраць кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 21. Садзейнічанне камісіям па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленні іх паўнамоцтваў

Дзяржаўныя і грамадскія органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі, службовыя асобы абавязаны садзейнічаць камісіям па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленні імі сваіх паўнамоцтваў, прадастаўляць неабходныя для іх работы звесткі і матэрыялы.

Камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мае права звяртацца па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, у дзяржаўныя і грамадскія органы, да кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, службовых асоб, якія абавязаны разгледзець пастаўленае пытанне і даць камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адказ не пазней чым у трохдзённы тэрмін.

Артыкул 22. Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Спіс грамадзян па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь складаецца па кожнаму ўчастку для галасавання і падпісваецца старшынёй і сакратаром участковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выканаўчыя камітэты гарадскіх, раённых у гарадах, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў забяспечваюць улік выбаршчыкаў і перадаюць участковым камісіям звесткі аб выбаршчыках, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі, неабходныя для складання спісаў выбаршчыкаў.

Спісы грамадзян Рэспублікі Беларусь -- ваеннаслужачых, якія

знаходзяцца ў воінскіх часцях, а таксама членаў сем'яў ваеннаслужачых і іншых выбаршчыкаў, калі яны пражываюць у раёнах размяшчэння воінскіх часцей, складаюцца на аснове даных, што прадстаўляюцца камандзірамі воінскіх часцей. Ваеннаслужачыя, якія пражываюць па-за воінскімі часцямі, уключаюцца ў спісы выбаршчыкаў па месцы жыхарства на агульных падставах.

Спісы выбаршчыкаў па ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях і дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбных установах, складаюцца на аснове даных, што прадстаўляюцца кіраўнікамі ўказаных устаноў.

Спісы выбаршчыкаў па ўчастках для галасавання, утвораных за межамі Рэспублікі Беларусь, складаюцца на аснове даных, што прадстаўляюцца кіраўнікамі дыпламатычных (консульскіх) прадстаўніцтваў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных дзяржаў.

У спіс выбаршчыкаў уключаюцца ўсе грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі да дня або ў дзень выбараў 18 гадоў, пастаянна або часова пражываюць да момант у складання спіса на тэрыторыі дадзенага ўчастка і маюць права ўдзельнічаць у галасаванні.

Выбаршчык не можа быць уключаны ў спісы выбаршчыкаў на іншых участках для галасавання.

Спісы выбаршчыкаў прадстаўляюцца для ўсеагульнага азнаямл іня за пятнаццаць дзён да выбараў, а на ўчастках, утвораных у санаторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбных установах, -- за два дні да выбараў.

Грамадзянам забяспечваецца магчымасць азнаёміцца са спісам выбаршчыкаў і праверыць правільнасць яго складання ў памяшканні ўчастковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кожнаму грамадзяніну прадастаўляецца права абскардзіць неўключэнне, няправільнае ўключэнне ў спіс або выключэнне са спіса, а таксама дапушчаныя ў спісе недакладнасці пры ўказанні даных аб выбаршчыку. Заява аб няправільнасцях у спісе разглядаецца ўчастковай камісіяй, якая абавязана не пазней чым у двухдзённы тэрмін, а напярэдадні і ў дзень выбараў неадкладна разгледзець заяву, унесці неабходныя выпраўленні ў спіс ці выдаць заяўніку копію матываванага рашэння аб адхіленні яго заявы. Рашэнне можа быць абскарджана не пазней чым за пяць дзён да выбараў у раённы (гарадскі) народны суд, які абавязаны разгледзець скаргу ў

.......

прохдзення тэрмін.

Рашэнне ўчастковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, размешчанай за межамі Рэспублікі Беларусь, у гэты ж тэрмін можа быць абскарджана ў раённы (гарадскі) народны суд па месцы знаходжання Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне раённага (гарадскога) народнага суда канчатковае. Выпраўленне ў спісе выбаршчыкаў у адпаведнасці з рашэннем суда праводзіцца неадкладна ўчастковай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 23. Парадак вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

Вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пачынаецца за 75 дзён.

Права вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь належыць:

1) дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у колькасці не менш чым 70 чалавек. Права вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь рэалізуюць шляхам збору подпісаў, пры гэтым дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь мае права ўдзельнічаць у вылучэнні толькі аднаго кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

2) грамадзянам Рэспублікі Беларусь -- пры наяўнасці не менш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў.

### Артыкул 24. Ініцыятыўная група грамадзян па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

У выпадку калі з ініцыятывай па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь выступаюць грамадзяне, утвараецца група па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (ініцыятыўная група па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь) з ліку асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, у колькасці не менш чым 30 чалавек.

Спіс членаў ініцыятыўнай групы з указаннем яе кіраўніка падаецца ў Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не пазней чым за 65 дзён да выбараў асобай, якая

вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты. У спісе ўказваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, прафесія, займаемая пасада (занятак), месца работы і жыхарства, партыйнасць асобы, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты, а таксама прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, даты нараджэння і месцы жыхарства членаў групы.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у пяцідзённы тэрмін рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае членам ініцыятыўнай групы для збору подпісаў выбаршчыкаў адпаведныя пасведчанні. Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца толькі членамі ініцыятыўнай групы.

У лістах для збору подпісаў выбаршчыкаў аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты (падпісных лістах) указваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, прафесія, займаемая пасада (занятак), месца работы і жыхарства, партыйнасць кандыдата ў Прэзідэнты, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку члена ініцыятыўнай групы, які збірае подпісы. У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць толькі ў адным населеным пункце, а ў гарадах з раённым дзяленнем -- у адным раёне.

Выбаршчыкі, якія падтрымліваюць кандыдатуру, указваюць у падпісным лісце сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння, месца жыхарства, нумар і серыю пашпарта або рэквізіты дакумента, які яго замяняе, дату подпісу і ўласнаручна распісваюцца. Подпісы нумаруюцца.

Асабісты ўласнаручны подпіс члена ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы выбаршчыкаў, ажыццяўляецца на кожным падпісным лісце ў прысутнасці старшыні або намесніка старшыні выканаўчага камітэта таго пасялковага, сельскага, гарадскога (гарадоў раённага і абласнога падпарадкавання), раённага ў горадзе Савета дэпутатаў, на тэрыторыі якога праводзіўся збор подпісаў, і неадкладна засведчваецца пячаткай выканаўчага камітэта Савета дэпутатаў па месцы збору подпісаў.

Падпісныя лісты здаюцца не пазней чым за 50 дзён да выбараў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая ў дзесяцідзённы тэрмін можа праверыць дакладнасць подпісаў выбаршчыкаў на падпісных лістах і забяспечвае дакладнасць даных аб колькасці такіх подпісаў. Аб колькасці выбаршчыкаў, што паставілі свае подпісы ў падпісных лістах па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты, складаецца пратакол, які неадкладна накіроўваецца ў адпаведную абласную, Мінскую

гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Праверыць дакладнасць подпісаў выбаршчыкаў на падпісных лістах пры неабходнасці могуць таксама абласныя і Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі ў падпісных лістах свае подпісы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты, абласная, Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падводзіць вынікі па вобласці, гораду Мінску, складае аб гэтым пратакол і неадкладна накіроўвае яго ў Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Адказнасць за дакладнасць даных, што змяшчаюцца ў падпісных лістах, нясе член ініцыятыўнай групы, які ажыццяўляў збор подпісаў. Падпісныя лісты, дзе выяўлены фіктыўныя подпісы або подпісы аднаго і таго ж выбаршчыка за двух і больш выбаршчыкаў ці подпісы грамадзян, якія не дасягнулі 18 гадоў, а таксама падпісныя лісты, не падпісаныя членам ініцыятыўнай групы або не засведчаныя пячаткай выканаўчага камітэта адпаведнага Савета дэпутатаў, прызнаюцца несапраўднымі.

### Артыкул 25. Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

Рэгістрацыя вылучаных кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Цэнтральнай камісіяй па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пачынаецца за 35 дзён і заканчваецца за 25 дзён да выбараў.

Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь прымаецца пры наяўнасці наступных дакументаў: падпіснога ліста пры наяўнасці ў ім не менш чым 70 подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, завераных Старшынёй або намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, у якім змяшчаюцца даныя аб кандыдаце ў Прэзідэнты, прадугледжаныя ў частцы чацвёртай артыкула 24 гэтага Закона, пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія пацвярджаюць наяўнасць больш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў Рэспублікі Беларусь па вылучэнню кандыдата ў

Прэзідэнты, а таксама заяву кандыдата аб згодзе балаціравацца.

Да рэгістрацыі прадстаўляецца любая колькасць кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на працягу двух дзён пасля рэгістрацыі выдае кандыдатам у Прэзідэнты адпаведныя пасведчанні.

Асоба, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і знаходзіцца ў складзе адной з камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, лічыцца вызваленай ад абавязкаў у камісіі з моманту рэгістрацыі яе кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не пазней чым на чацвёрты дзень пасля рэгістрацыі кандыдатаў перадае ў сродкі масавай інфармацыі паведамленне аб рэгістрацыі з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння, прафесіі, займаемай пасады (занятку), партыйнасці, месца работы і жыхарства кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Адмова Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зарэгістраваць асобу, вылучаную кандыдатам у Прэзідэнты, можа быць з яе згоды абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь групай дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або ініцыятыўнай групай грамадзян па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія вылучылі яго. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін. Рашэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляецца канчатковым.

Артыкул 26. Давераныя асобы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь можа мець да 20 давераных асоб, якія дапамагаюць яму ў правядзенні выбарчай кампаніі, вядуць агітацыю за выбранне яго Прэзідэнтам, прадстаўляюць інтарэсы кандыдата ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі і грамадскімі органамі, выбаршчыкамі, а таксама ў камісіях па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь вызначае давераных асоб паводле свайго меркавання і паведамляе аб іх для рэгістрацыі ў Цэнтральную камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая пасля рэгістрацыі выдае ім пасведчанні. Кандыдат у Прэзідэнты

Country BELARUS

Year 1994 Language RUSSIAN

Description Presidential Election law and accompanying declarations

IFES developed/sponsored? —